**МЕЙЛАХ Аляксандр Канстанцінавіч,** н. у 1896, бухгалтар абласнога суда, расстраляны ў студзені 1943.

**ШЭМЕТ Сцяпан Паўлавіч,** н. у 1904, памочнік начальніка аддзела ветэрынарнай службы 26-й арміі, расстраляны ў верасні 1943.

Спіс падрыхтавала
*Т. Піліпчук*

## Мазыршчына партызанская

Канкрэтная праграма разгортвання ўсенароднага змагання з ворагам на акупіраванай ім тэрыторыі была выкладзена ў дырэктыве СНК СССР і ЦК ВКП(б) партыйным, савецкім арганізацыям прыфрантавых абласцей ад 29 чэрвеня 1941 г. і ў спецыяльнай пастанове «Аб арганізацыі барацьбы ў тыле германскіх войск», прынятай ЦК ВКП(б) 18 ліпеня гэтага ж года.

Усёй практычнай работай па стварэнні патрыятычнага падполля і першых партызанскіх атрадаў у Беларусі кіраваў ЦК КП(б)Б. Ім былі распрацаваны і накіраваны на месцы дырэктывы, у якіх кіруючыя партыйныя органы абавязваліся загадзя рыхтавацца да работы ва ўмовах падполля, ствараць базу для разгортвання партызанскага руху.

Ствараліся партызанскія атрады і на тэрыторыі Палескай вобласці. Тут праходзілі важныя чыгуначныя магістралі, наяўнасць вялікіх лясоў таксама спрыяла развіццю партызанскага руху.

Мазыр працяглы час служыў базай для накіравання ў тыл ворага на нелегальную работу ў Пінскую, Мінскую і іншыя вобласці арганізатараў барацьбы з ворагам. Пасля акупацыі Пінска гітлераўцамі 4 ліпеня 1941 г. у Мазыр пераехалі абласныя партыйны і камсамольскі камітэты, адсюль яны накіроўвалі на тэрыторыю Пінскай вобласці сваіх партызан і падпольшчыкаў. Людзі, якія ішлі ў тыл ворага, атрымлівалі тут матэрыяльнае забеспячэнне, вопытных праваднікоў, праходзілі кароткатэрміновае абучэнне.

Другі сакратар Палескага абкама партыі Ф. М. Языковіч, сакратары райкамаў падбіралі кадры і фарміравалі падполле на выпадак акупацыі Мазыршчыны. Як паведамляў у ЦК КП(б)Б першы сакратар абкама П. А. Лявіцкі, ужо да 12 ліпеня 1941 г. у большасці раёнаў вобласці былі арганізаваны падпольныя партыйныя ячэйкі, а ў астатніх яны ствараліся.

23 ліпеня 1941 г. у Мазыры адбылося пасяджэнне бюро Палескага абкама партыі, на якім прысутнічалі сакратары ЦК КП(б)Б В. Г. Ванееў і В. Я. Уласаў, сакратары абкама партыі, кам-



Запіска з фашысцкай турмы. Мазыр, сакавік 1943



П. А. Лявіцкі. Мазыр, 1944

самола і іншыя кіруючыя работнікі вобласці. На ім былі падведзены вынікі работы па выкананні партыйных дырэктыў. Бюро зацвердзіла склад раённых партыйных троек, каманднa-палітычны састаў партызанскіх атрадаў. Для кіраўніцтва імі была ўтворана абласная партыйная тройка (Ф. Языковіч, Т. Зайцаў і І. Івашчанка).

Для кіраўніцтва партызанскім рухам і патрыятычным падполлем на тэрыторыі Мазырскага раёна быў пакінуты сакратар райкама партыі М. І. Макаранка, членамі тройкі прызначаны І. Г. Кавальчук і І. І. Маркаў. Для работы ў тыле ворага ў вобласці было створана 176 падпольных партыйных арганізацый, а абкам камсамола пад кіраўніцтвам першага сакратара М. Л. Пінязіка падабраў і пакінуў для работы ў тыле ворага 675 камсамольцаў. Было створана 8 разведгруп.

З прыходам фашыстаў, з 22 жніўня, прыступіў да баявых дзеянняў Мазырскі партызанскі атрад, створаны на базе знішчальнага батальёна ў тым жа месяцы. Асабовы склад яго быў укамплектаваны ў асноўным прадстаўнікамі партыйна-савецкага і камсамольскага актыву Мазырскага раёна, якія па розных прычынах не былі прызваны ў Чырвоную Армію. У склад атрада ўвайшлі: М. І. Макаранка – другі сакратар Мазырскага РК КП(б)Б, Л. П. Рудзеня – старшыня райвыканкама, Ф. А. Каменскі – намеснік старшыні райвыканкама, І. А. Міцура – старшыня калгаса з вёскі Бабры, М. К. Куцько – старшыня калгаса «Абарона» (вёска Касцюковічы), Д. М. Гнедзька – старшыня калгаса «Мазыршчына» (вёска Слабада), З. І. Лук'яновіч – старшыня Прудкоўскага сельсавета, Х. А. Урэцкі – старшыня калгаса «XVII партз'езд» (вёска Іванкаўшчына), Е. Д. Сітнік – старшыня Скрыгалаўскага сельсавета, Ф. С. Валасюк – старшыня калгаса з вёскі Белая, М. Ф. Уласенка – сакратар Каменкаўскага сельсавета, П. В. Падлобнікаў – загадчык Казіміраўскай пачатковай школы, Л. Г. Грамовіч – старшыня Бібікаўскага сельсавета, І. Я. Карпаў – інструктар палітаддзела Упраўлення міліцыі Палескай вобласці і іншыя. Усяго ў атрадзе было каля 50 чалавек. Камандзірам яго быў прызначаны М. І. Макаранка, камісарам – П. І. Счаслаўскі.

Вялікую ўвагу камандаванне атрада ўдзяляла распаўсюджванню звестак сярод насельніцтва аб становішчы на савецка-германскім фронце. Было наладжана праслухоўванне савецкіх радыёперадач, і змест іх вусна або з дапамогай лістовак распаўсюджваўся сярод насельніцтва.

Партызаны вывелі са строю электрастанцыю, знішчылі мост цераз Прыпяць і чыгуначны мост на станцыі Мытва, псавалі сувязь. Значную дапамогу аказвалі партызаны воінам-акружэнцам у пераходзе лініі фронту. У кастрычніку 1941 г. большая частка атрада на чале з яго камандзірам, пасля страты некалькіх баз і цяжкіх баёў з карнікамі, накіравалася праз лінію фронту на злучэнне з часцямі Чырвонай Арміі. Частка партызан перайшла да падпольнай барацьбы.

У Мазыры па ініцыятыве гаркама КП(б)Б, з дапамогай абкама партыі быў створаны і другі партызанскі атрад. Ён налічваў 160 чалавек. Камандзірам яго быў прызначаны старшыня калгаса «Пралетарый» П. Р. Мардусевіч, камісарам – работнік фабрыкі «Прафінтэрн» І. Александровіч, сакратаром партыйнай арганізацыі – сакратар Мазырскага РК КП(б)Б Ш. А. Голуб,

сакратаром камсамольскай арганізацыі атрада — старшыня Мялешкавіцкага сельспажыўтаварыства М. А. Дубавец. Атрад пэўны час дзейнічаў у Мазырскім раёне, а затым у верасні 1941 г. перайшоў у лясныя масівы Брагінскага раёна. Далейшы лёс атрада невядомы.

Махнавіцкі партызанскі атрад быў створаны ў жніўні 1941 г., у яго склад увайшлі партыйна-савецкія і камсамольскія актывісты Махнавіцкага сельскага савета Ельскага (цяпер Мазырскага) раёна. Камандзірам атрада быў прызначаны начальнік Ельскай раённай міліцыі Я. Ф. Ганчарэнка, камісарам — дырэктар Ельскага лясгаса Я. Д. Пярлоў. Партызаны падрывалі масты, тэлеграфна-тэлефонную сувязь, вялі палітычную агітацыю сярод насельніцтва, знішчалі фашысцкіх паслугачоў і шпіёнаў. Былі спалены і ўзарваны 4 масты. У атрадзе налічвалася 89 байцоў, але толькі менш як палова з іх была ўзброена вінтоўкамі. Частка зброі была атрымана ад украінскіх атрадаў.

З дапамогай здраднікаў гітлераўцам удалося вызначыць месца дыслакацыі атрада, і ён быў акружаны. З акружэння вырвалася пасля жорсткага бою каля 40 чалавек, якія на чале з камісарам Я. Д. Пярловым уліліся ў Качышчанскі партызанскі атрад Ельскага раёна.

На тэрыторыі раёна ў цяперашніх межах у ваколіцах вёсак Асавец і Турбінка ў жніўні — кастрычніку 1941 г. дзейнічаў партызанскі атрад пад кіраўніцтвам першага сакратара Петрыкаўскага райкама партыі Х. І. Варгаўціка. 10 кастрычніка 1941 г. ён загінуў у баі, большасць байцоў падалася за лінію фронту.

Цяжкасці станаўлення партызанскага руху вызначаліся вострым недахопам зброі, боепрыпасаў, медыкаментаў, суровасцю першай ваеннай зімы. Не было вопыту ўзброенай барацьбы з моцным, узброеным ворагам. На барацьбу з партызанамі вораг кінуў спрактыкаваны, бязлітасны і зладжаны карны апарат. А ў народных мсціўцаў яшчэ не наладзілася як след сувязь з патрыятычна настроеным насельніцтвам.

Адразу пасля акупацыі горада ў Мазыры гітлераўцы пачалі ствараць карныя і контрразведвальныя органы, а таксама органы «парадку» на чале з адпетымі катамі: Гале — гебітскамісарам, начальнікам раённай жандармерыі, афіцэрам СД Розенталем, Вітке — загадчыкам аддзела «аховы здароўя», Стэфанам — загадчыкам аддзела «асветы».

Пры жандармерыі былі сфарміраваны падраздзяленні карнікаў: жандарская часць (2 афіцэры і 55 жандараў), матарызаваны ўзвод (1 афіцэр і 36 жандараў), вучэбная ахоўная рота (1 афіцэр, 4 фельдфебелі і 3 узводы жандармерыі). Акрамя таго, з ліку здраднікаў былі створаны мазырскія гарадская, раённая, водная паліцыя і паліцыя ў Скрыгалаўскай воласці. Гэтыя падраздзяленні прымалі непасрэдны ўдзел у масавых расстрэлах падпольшчыкаў, партызан і іх сем'яў, а таксама мірных савецкіх грамадзян.

Фашысты не абмяжоўваліся адкрытым насіллем і забойствамі, яны імкнуліся ў першую чаргу знішчыць тых, хто, на іх думку, уяўляў найбольшую небяспеку для «рэйха». З гэтай мэтай ствараліся разведвальныя органы з разгалінаванай сеткай шпіёнаў і правакатараў. У Мазыры і Калінкавічах дзейнічалі рэзідэнтуры «зондэрштаба-Р». «Абвер» паставіў перад імі задачу: весці агентурную разведку і разлажэнне партызанскіх атрадаў, выяўляць падпольныя антыфашысцкія групы і асоб, звязаных з партызанамі. У такіх складаных умовах значная частка партызанскіх атрадаў Палескай вобласці не змагла замацавацца ў зададзеных раёнах дыслакацыі, і яны пайшлі за лінію фронту. Аднак вопыт узброенай барацьбы першых партызанскіх атрадаў, набыты ў пачатковы перыяд акупацыі, адыграў вялікую ролю ў разгортванні партызанскага руху.

Перамога Чырвонай Арміі пад Масквой, вестка аб якой дайшла да ўсіх куткоў Беларусі, актывізавала савецкіх людзей у тыле ворага.

Выкарыстоўваючы больш спрыяльнае становішча, якое склалася пасля перамогі пад Масквой, ЦК КП(б)Б узмацніў арганізатарскую і палітычную работу, каб надаць партызанскай барацьбе з ворагам масавы характар. З гэтай мэтай у тыл ворага накіроўваліся новыя кадры для арганізацыі патрыятычнага падполля і партызанскага руху.

У Мазырскі раён у сакавіку — красавіку 1942 г. з-за лініі фронту прыслалі 2 арганізатарскія групы на чале з былым сакратаром Мазырскага ГК КП(б)Б А. К. Бяляевым і Я. А. Татаравым. Яны мелі рацыі, што дазваляла ўстанавіць надзейную сувязь партызан з цэнтрам.

З вясны 1942 г. партызанскі рух прымае шырокі размах. У другой палове 1942 г. актывізавалі свае баявыя дзеянні народныя мсціўцы. Так, партызанскі атрад імя Варашылава з 2 па 20 жніўня 1942 г. правёў рад баявых аперацый па зрыву паставак правіянту гітлераўцам. Былі разгромлены два малаказборныя сепаратарныя пункты. Для разгрому буйных варожых гарнізонаў у партызан не хапала сіл і вопыту, але і ў гэтых аперацыях яны здабылі больш як 20 вінтовак, знішчылі дзве легкавыя аўтамашыны, забілі і паранілі некалькі афіцэраў праціўніка.

Позняй восенню 1942 г. у паўднёвыя раёны Палесся з бранскіх лясоў прыбылі ўкраінскія партызанскія злучэнні С. А. Каўпака, А. М. Сабурава і А. Ф. Фёдарава. Гэтыя злучэнні папаўняліся мясцовымі жыхарамі. У рады ўкраінскіх і малдаўскіх (злучэнне якіх пачало дзейнічаць на Палессі з мая 1943 г.) народных мсціўцаў уліліся многа жыхароў Мазырскага раёна.

Жыхары вёскі Перадрэйка Асавецкага сельсавета А. Піскун і Ю. Галіцкі ў 1942 г. уступілі ў злучэнне украінскіх партызан А. Ф. Фёдарава і неаднаразова хадзілі на падрыў варожых эшалонаў на чыгункі Ковель — Александрыя — Журавічы, Ковель — Роўна. У гэтым батальёне змагаліся і іх землякі Васіль Кавальчук, І. Шаставец, П. Сарока, Ф. Марціновіч і іншыя патрыёты.

У перадваенны час Рыгор Марціновіч, Яўхім Цалка, Аляксандр Канавальчук вучыліся ў Асавецкай школе Мазырскага (раней Петрыкаўскага) раёна. У перыяд акупацыі разам пайшлі ў партызаны. Р. Марціновіч змагаўся ў партызанскім атрадзе імя Кожухава. Я. Цалка ўступіў у партызанскае злучэнне генерала А. Фёдарава. У адным з баёў на тэрыторыі Заходняй Украіны ён загінуў смерцю храбрых. Аляксандр і В. Канавальчукі ўступілі ў атрад імя У. І. Леніна злучэння ўкраінскіх партызан генерала А. М. Сабурава.

Вялікую ролю ў развіцці партызанскага руху і патрыятычнага падполля ў гэты час адыгралі ўпаўнаважаныя партыйных і камсамольскіх кіруючых органаў.

У лістападзе 1942 г. ЦК ЛКСМБ прызначыў упаўнаважаным ЦК па Палескай вобласці сакратара абкама камсамола М. Л. Пінязіка, у ліпені гэтага ж года па рашэнні ЦК ЛКСМБ у ліку пяці камсамольскіх работнікаў у вобласць быў накіраваны і У. К. Рудак. Прайшоўшы па тылах праціўніка звыш 1200 км, ён восенню 1942 г. дасягнуў Палесся і неўзабаве быў прызначаны ўпаўнаважаным ЦК у Паўднёва-Прыпяцкую зону, куды ўваходзіў і Мазырскі раён. Для аказання практычнай дапамогі мясцовым камсамольскім работнікам у Палескую і іншыя вобласці прыбылі і адказныя камсамольскія работнікі, якіх узначальваў сакратар ЦК ЛКСМБ К. Т. Мазураў.

У снежні 1942 г. камандаванне Калінкавіцкага партызанскага атрада імя Варашылава стварыла ініцыятыўную групу партызан для арганізацыі новага партызанскага атрада, які атрымаў імя М. В. Фрунзе. У яго ўступіў і кіраўнік Міхалкаўскай падпольнай камсамольскай арганізацыі Аляксандр Та-



А. А. Валасевіч



Т. Я. Мароз

расаў, які хутка быў прызначаны камандзірам узвода. 12 лютага 1943 г. партызаны А. Тарасава прынялі бой са славакамі ля вёскі Міцькі Мазырскага раёна. Былі забіты афіцэр і пяць салдат праціўніка. Партызаны страт не мелі. 24 чэрвеня 1943 г. група падрыўнікоў на чале з А. Тарасавым замініравала чыгунку на перагоне Мазыр — Ельск непадалёку ад станцыі Мытва. Пад адхон паляцела 18 вагонаў з жывой сілай, было забіта і паранена каля батальёна салдат і афіцэраў праціўніка, знішчаны дзве цыстэрны з гаручым. Група партызан, якую ўзначальваў А. Тарасаў і падрыўнік С. П. Пакацін, была паслана на падрыў чыгункі Мазыр — Ельск. У вёсцы Міхалкі падрыўнікі нарваліся на варожую засаду. У перастрэлцы былі забіты афіцэр і 2 салдаты праціўніка. У гэтым баі загінуў камандзір узвода Аляксандр Паўлавіч Тарасаў.

З пашырэннем партызанскага руху ў суседніх раёнах стварыліся ўмовы для арганізацыі партызанскіх фарміраванняў і на тэрыторыі Мазырскага раёна, побач з абласным цэнтрам. Пачатак гэтаму паклала рашэнне Палескага падпольнага абкама КП(б)Б і абласнога штаба партызанскага злучэння ад 22 лютага 1943 г. аб арганізацыі Мазырскага партызанскага атрада на базе групы народных мсціўцаў з 12 чалавек, выдзеленых з Ельскага партызанскага атрада. Камандзірам атрада быў прызначаны А. Л. Жыльскі, а камісарам і сакратаром Мазырскага падпольнага райкама КП(б)Б М. К. Ільінкоўскі. У групу былі падабраны партызаны, якія добра ведалі Мазырскі раён: Антон Валасевіч, Кузьма Каменскі, Пётр Лузан, Аляксандр Ганчар, Андрэй Дубавец, Мікалай Кірушкін, Аляксандр Пешка, Васіль Пальчэўскі і іншыя, у асноўным жыхары вёсак Казіміраўка, Мялешкавічы і Слабада Мазырскага раёна.

Стварыць атрад трэба было ў надзвычай складаных умовах, паблізу абласнога цэнтра, варожы гарнізон якога налічваў больш за 4 тысячы чалавек. Гарнізоны размяшчаліся ў многіх навакольных вёсках. У Козенках дыслакаваліся 2 пяхотныя батальёны, у Бярозаўцы, Антонаўцы, Свірынаўцы — 2 сапёрныя батальёны, у Барыскавічах — 1500 салдат і афіцэраў, у Міхалках — 3 тысячы, у Прудку — 500, Слабадзе — 500, у Скрыгалаве — 350, у Белай, Надатках — да батальёна гітлераўцаў.

Размясціўшыся ў Мялешкавіцкіх лясах, група перш за ўсё наладзіла сувязь з мясцовым насельніцтвам. Падбіраліся людзі для атрада. Кандыдатаў у атрад правяралі ў баі, а затым залічвалі. Усіх жадаючых уступіць у рады народных мсціўцаў не заўсёды можна было прыняць з-за вострага недахопу зброі. Праз два-тры тыдні ў атрадзе ўжо было каля 50 чалавек. Толькі з вёскі Іванкаўшчына ў яго рады за адну ноч уступіла 15 чалавек. Атрад быў падзелены на тры ўзводы.

Для больш аператыўнага кіраўніцтва баявой дзейнасцю партызанскіх фарміраванняў, размешчаных на поўдзень ад Прыпяці, штаб Палескага партызанскага злучэння загадам ад 19 мая 1943 г. стварыў у гэтым рэгіёне партызанскае злучэнне Паўднёва-Прыпяцкай зоны, у склад якога былі ўключаны партызанскія атрады Ельскага, Мазырскага, Нараўлянскага, Лельчыцкага і Тураўскага раёнаў (камандзіры злучэння: М. С. Дзячэнка (май 1943 — верасень 1943, загінуў), А. М. Бяленчык (верасень



Ц. П. Бумажкоў



Р. С. Аўдзяйчук

1943 – студзень 1944), камісар Бяленчык, начальнік штаба Р. С. Аўдзяйчук).

23 чэрвеня 1943 г. з Мазырскага партызанскага атрада выдзелена група для арганізацыі новага атрада, а да канца верасня гэтага года Мазырскі партызанскі атрад вырас у партызанскую брыгаду, якой было прысвоена імя Аляксандра Неўскага. Яна створана 28 верасня 1943 г. Брыгада дзейнічала ў Мазырскім, Ельскім і Петрыкаўскім раёнах.

Камандзір брыгады А. Л. Жыльскі (верасень 1943 – студзень 1944), камісары М. К. Ільінкоўскі (жнівень 1943 – снежань 1943), М. С. Кірушкін (снежань 1943 – студзень 1944), начальнік штаба М. А. Забораў (верасень 1943 – студзень 1944).

1-шы атрад арганізаваны ў лютым 1943 г. Камандзіры атрада: А. Л. Жыльскі (люты 1943 – верасень 1943), А. Д. Колас (верасень 1943 – студзень 1944), камісары: М. К. Ільінкоўскі (люты 1943 – верасень 1943), А. С. Ганчар (верасень 1943 – студзень 1944), начальнікі штаба: М. А. Забораў (люты 1943 – верасень 1943), К. Д. Каменскі (верасень 1943 – студзень 1944).

3-ці атрад арганізаваны на базе ініцыятыўнай групы (15 чалавек) у чэрвені 1943 г., выдзеленай першым атрадам, да 20 верасня 1943 г. называўся другім. Камандзіры атрада: І. М. Уласенка (чэрвень 1943 – жнівень 1943), А. Р. Мішура (жнівень 1943 – студзень 1944), камісар П. М. Лузан (чэрвень 1943 – студзень 1944), начальнік штаба П. Л. Лузан (верасень 1943 – студзень 1944).

2-гі атрад сфарміраваны 28 верасня 1943 г. з асабовага складу, выдзеленага першым і трэцім атрадамі брыгады. Камандзір атрада – М. З. Патапаў, камісар – У. Д. Лук'яновіч, начальнік штаба – І. М. Уласенка (усе верасень 1943 – студзень 1944).

Барацьба з ворагам з кожным днём шырылася. Удары па ворагу нарасталі з павелічэннем сіл атрада, а затым брыгады. Узвод партызан Мазырскага атрада пад камандаваннем П. М. Лузана тры разы рабіў засады на дарозе Мазыр – Скрыгалаў. Вораг панёс страты. 12 красавіка 1943 г. група партызан пад камандаваннем П. М. Лузана зноў арганізавала засаду каля вёскі Хамічкі. Вораг страціў афіцэра і чатырох салдат.

12 чэрвеня 1943 г. група народных мсціўцаў колькасцю ў 30 чалавек на чале з А. Д. Коласам зрабіла засаду на калону праціўніка ў 150 чалавек каля дарогі паміж вёскамі Вялікія і Малыя Зімовішчы. Было забіта 6 і паранена 8 варожых салдат. Акрамя гэтага, партызаны адбілі ў гітлераўцаў 50 галоў жывёлы, нарабаванай у насельніцтва. Праз 10 дзён узвод партызан пад камандаваннем А. Валасевіча ўступіў у бой з калонай гітлераўцаў. Было забіта і паранена 15 гітлераўцаў.

Актывізацыя баявой дзейнасці партызан не давала спакою акупантам. 5 ліпеня 1943 г. фашысцкія войскі зрабілі вылазку супраць партызан каля вёскі Буда Казіміраўская. З-за перавагі ворагаў баявыя патрулі атрада вымушаны былі адступіць. Па загаду камандзіра атрада А. Л. Жыльскага А. Колас і У. Лук'яновіч арганізавалі засаду і нанеслі гітлераўцам раптоўны ўдар. Страціўшы 30 чалавек забітымі і параненымі, праціўнік адступіў.

Мазырскі партызанскі атрад меў вострую патрэбу ў зброі, боепрыпасах і выбуховых матэрыялах. З базы Палескага абкама партыі дапамога зброяй не

магла паступаць рэгулярна. Абкам базіраваўся ў Любанскім раёне, і трэба было перапраўляць баявыя грузы праз пільна ахоўваемую ворагам чыгунку Брэст — Гомель і раку Прыпяць, што было вельмі цяжка.

Выручыла дружба з украінскімі партызанскімі злучэннямі. У маі 1943 г. камандаванне атрада звярнулася па дапамогу да злучэння А. М. Сабурава. Туды была паслана група партызан Мазырскага атрада на чале з камісарам М. К. Ільінкоўскім. Яна вярнулася з мінамі, гранатамі, выбуховымі рэчывамі, ручным кулямётам. У сваю чаргу, камандаванне Мазырскага атрада накіравала ў злучэнне Сабурава па яго просьбе 50 чалавек папаўнення са свайго рэзерву. У ноч з 29 на 30 мая 1943 г. група падрыўнікоў Мазырскага атрада пад кіраўніцтвам Паўла Доўгага пусціла пад адхон варожы эшалон на перагоне чыгункі Мазыр — Мытва. На мінах, пастаўленых партызанамі на дарозе Мазыр — Скрыгалаў, падарваліся дзве варожыя аўтамашыны. Было забіта і паранена 16 гітлераўцаў.

Калі запасы толу скончыліся, зноў звярнуліся да ўкраінскіх партызан. Дэлегацыю мазыран на чале з камісарам атрада М. К. Ільінкоўскім у вёсцы Картынічы Лельчыцкага раёна прыняў начальнік Украінскага штаба партызанскага руху Т. А. Строкач. Атраду была аказана дапамога зброяй, боепрыпасамі, выбуховымі рэчывамі.

З дапамогай падпольшчыкаў народныя мсціўцы здабылі ў насельніцтва 33 вінтоўкі, 6 пісталетаў і наганаў, 24 тыс. патронаў.

Узаемадапамога ўкраінскіх і палескіх партызан праяўлялася і ў арганізацыі сумесных баявых дзеянняў супраць захопнікаў. Адной з буйнейшых баявых аперацый на тэрыторыі Мазырскага раёна быў разгром моцнага варожага гарнізона ў вёсцы Скрыгалаў аб'яднанымі сіламі мазырскіх, лельчыцкіх і ўкраінскіх партызан са злучэнняў А. Сабурава і А. Фёдарава. Жандарска-паліцэйскі гарнізон у Скрыгалаве знаходзіўся з 1941 г. Адсюль гітлераўцы рабілі налёты на вёскі Астражанка, Убарцьская Рудня, Замошша Лельчыцкага раёна, Асавец, Глініца, Крушнікі і іншыя вёскі Мазырскага раёна.

План разгрому гарнізона распрацавалі начальнік штаба Лельчыцкага партызанскага атрада П. Р. Ганчароў і камандзір аднаго з батальёнаў злучэння А. М. Сабурава К. Баліцкі. Падрабязныя звесткі аб гарнізоне даў партызанам жыхар Скрыгалава Іван Галушка. Ён перадаў таксама народным мсціўцам 250 патронаў, некалькі гранат і згадзіўся вывесці іх на зручныя для атакі пазіцыі. Да Скрыгалава ішлі і мазырскія партызаны, якіх правялі сувязныя з вёскі Лешня.

У ноч з 3 на 4 чэрвеня 1943 г. народныя мсціўцы скрытна падышлі да Скрыгалава, гарнізон якога налічваў 25 нямецкіх салдат і 235 паліцэйскіх. На досвітку партызаны адкрылі з усёй наяўнай зброі дружны агонь і ўварваліся ў вёску. Варожы гарнізон разбегся, пакінуўшы забітых і параненых. Кіраўніцтва разгромам гарнізона ажыццяўляў К. Баліцкі. З Мазыра да гітлераўцаў падышоў на дапамогу матапяхотны полк з артылерыяй. У бой з ім уступіла засада на чале з камандзірам Лельчыцкага атрада Г. В. Федаровічам. Ён быў цяжка паранены.

У чэрвені 1943 г. рабіліся ўдалыя вылазкі, засады і дыверсіі мазырскіх партызан. Ад падпольшчыкаў вёскі Козенкі было атрымана паведамленне, што ноччу з 17 на 18 чэрвеня праз мясцовую станцыю пройдзе варожы эшалон з жывой сілай і вайсковымі грузамі. Дыверсійная група Антона Качаноўскага прыняла рашэнне падарваць гэты эшалон. Да чыгункі падышлі днём з лесу і да ночы схаваліся. Ноччу бясшумна замініравалі палатно. Самаробная міна спрацавала бездакорна, цягнік пайшоў пад адхон. Узарваліся і два вагоны з боепрыпасамі. З уцалелых вагонаў гітлераўцы адкрылі шалёны агонь. Гарнізон жа станцыі Козенкі, не разабраўшыся ў сітуацыі, адкрыў артылерый-

скі і кулямётны агонь па сваіх, прычыніўшы ім яшчэ большыя страты. Як устанавіла разведка, гэтая дыверсія дорага абышлася ворагу. Былі знішчаны паравоз, два вагоны з боепрыпасамі, чатыры з тэхнікай і некалькі з жывой сілай.

Дыверсійная група А. Г. Качаноўскага пазней падарвала яшчэ два варожыя цягнікі. Антон Герасімавіч праявіў сябе і добрым разведчыкам. Неаднаразова ён пераапранаўся ў жаночае адзенне і хадзіў у разведку ў Мазыр, на станцыю Козенкі, дзе ў славацкага афіцэра здабыў аўтамат.

Скрыгалаўскі бой і цэлая серыя іншых удалых аперацый народных мсціўцаў не давалі спакою гітлераўскаму ваеннаму камандаванню. Яно вырашыла правесці супраць партызанскіх фарміраванняў Паўднёва-Прыпяцкай зоны буйную карную экспедыцыю. Аб яе падрыхтоўцы камандаванне партызанскага атрада даведалася загадзя. 19 чэрвеня 1943 г. Мазырскі падпольны райкам КП(б)Б атрымаў некалькі трывожных паведамленняў. У горад прыбылі новыя варожыя войскі. З Калінкавіч у раёне вёскі Навікі пачала пераправу цераз Прыпяць вайсковая часць фашыстаў. Наладжвалася пераправа і ў раёне вёскі Загорыны. У вёсцы Бабры сканцэнтравалася шмат аўтамашын праціўніка. Па даных мазырскіх падпольшчыкаў галоўны ўдар карнікі намячалі супраць партызан, якія размяшчаліся каля вёскі Зялёны Мох і ў Лельчыцкіх лясах. Там акрамя беларускіх атрадаў дыслакавалася і ўкраінскае злучэнне генерала А. М. Сабурава. Фашысты планавалі таксама ліквідаваць аэрадром злучэння ў раёне вёскі Дубніцкае Лельчыцкага раёна.

Мазырскія партызаны адчувалі востры недахоп боепрыпасаў. На сваім пасяджэнні Мазырскі падпольны райкам партыі прыняў рашэнне не ўвязвацца ў сутыкненне з буйнымі сіламі праціўніка, вывесці фарміраванне з Зялёнага Моха і размясціцца паатрадна паблізу вёсак Васькаўка, Слабада, Надаткі. Было загадана рабіць засады, мініраваць дарогі, а на шляху Мазыр — Лельчыцы зрабіць завалы. Райкам партыі накіраваў групу партызан на чале з М. К. Ільінкоўскім да А. М. Сабурава, каб паведаміць аб пагрозе фашысцкага наступлення і прасіць памагчы боепрыпасамі. Карная экспедыцыя пачалася 25 чэрвеня 1943 г. У гэтых умовах група Ільінкоўскага прабіцца назад да сваіх ужо не змагла. У карнай экспедыцыі ўдзельнічала каля 60 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў. Наступленне вялося з Мазыра, Ельска, Оўруча, Алеўска і Петрыкава. Галоўныя сілы нямецкіх карнікаў былі сканцэнтраваны ў вёсцы Буйнавічы Лельчыцкага раёна. Перадавыя атрады ворага пераапраналіся ў цывільнае адзенне, якое звычайна насілі партызаны.

Разам з сабураўцамі група мазырскіх партызан вяла бой з карнікамі ў Лельчыцкім, а затым і Тураўскім раёнах.

Асноўныя сілы Мазырскай партызанскай брыгады правялі некалькі ўдалых засад, не раз прарываліся з варожага акружэння, нанеслі ворагу значныя страты. У саставе брыгады змагалася ў той час адрэзаная блакадай ад свайго батальёна група ўкраінскіх партызан. Пасля правалу гітлераўскай карнай экспедыцыі група М. К. Ільінкоўскага злучылася з асноўнымі сіламі брыгады ў Махнавіцкіх лясах.

У жніўні 1943 г. Мазырскі падпольны райкам партыі падвёў вынікі дзейнасці партызан за паўгода (сакавік — жнівень). За гэты час арганізатарская група вырасла ў два атрады, затым у верасні — у брыгаду, якая налічвала звыш 200 байцоў. На ўзбраенні мелася 128 вінтовак, 28 аўтаматаў, 6 кулямётаў, 45 пісталетаў, гранаты. Усё гэта здабыта ў баях з ворагам. За гэты перыяд пушчаны пад адхон тры эшалоны праціўніка, разбіты 3 і пашкоджаны 2 паравозы, 24 вагоны, 30 аўтамашын, спалены на Прыпяці 2 караваны суднаў, маторная лодка, ліквідаваны 2 маслазаводы, выведзена са строю 25 км

сувязі, разбурана многа мастоў. Забіта звыш 300 і паранена каля 200 гітлераўцаў.

У канцы жніўня 1943 г. камандаванне мазырскіх партызанскіх атрадаў прыняло рашэнне разграміць гарнізон праціўніка ў вёсцы Шчакатава. Дамовіліся з генералам А. М. Сабуравым аб сумеснай баявой аперацыі. Генерал узяў агульнае кіраўніцтва аперацыяй на сябе. У ёй удзельнічала 295 сабураўцаў і 220 мазырскіх партызан, якім была пастаўлена задача блакіраваць варожы гарнізон у Слабадзе і не дапусціць падыходу падмацавання ворагу са Скрыгалава.

У ноч з 31 жніўня на 1 верасня 1943 г. быў нанесены раптоўны ўдар па гарнізонах Шчакатавы і Слабады. На світанні аўтаматчыкі злучэння А. Сабурава выйшлі на дарогу Шчакатава — Козенкі, перарэзалі тэлефонны кабель, каб акупанты не змаглі выклікаць падмацаванне з Козенак, і зрабілі засаду. Байцы Мазырскага атрада ўзялі пад кантроль дарогі Слабада — Шчакатава і Рудня — Шчакатава. Націск атакуючых прымусіў ворага пакінуць вёскі. Падмацаванне, якое ішло з Козенак, партызаны сустрэлі агнём і рассеялі. Больш ста акупантаў было выведзена са строю. У якасці трафеяў народныя мсціўцы ўзялі 4 кулямёты, 93 вінтоўкі, а таксама 120 коней і 3 тоны збожжа.

У гэтым баі атрымалі баявое хрышчэнне і звыш 3 дзесяткаў жыхароў вёсак Вялікія і Малыя Зімовішчы, якія ўступілі ў злучэнне Сабурава перад самай аперацыяй. Вызначыўся мінамётчык Ф. Д. Ропат. Смерцю храбрых загінуў кулямётчык Мітрафан Колас, цяжка паранены быў К. С. Паўлюк.

Паспяховыя баявыя дзеянні народных мсціўцаў павышалі іх аўтарытэт сярод насельніцтва. У брыгаду ўступалі не толькі людзі сталага ўзросту і моладзь, але і падлеткі. Восенню 1943 г. трынаццацігадовыя Арсень Пузан з вёскі Лешня Мазырскага раёна і Грыша Гурыновіч са станцыі Мазыр сустрэліся ў лесе і вырашылі ісці ў партызаны. Хлопчыкі выкралі ў гітлераўцаў 26 аўтаматаў і даставілі іх у атрад.

Мазырскія партызаны прынялі актыўны ўдзел у баявых аперацыях «рэйкавай вайны». Падрыўной справе было абучана 65 працэнтаў асабовага складу. У ноч на 19 верасня 1943 г. народныя мсціўцы нанеслі масіраваны ўдар па чыгунцы на ўчастку Ельск — Мытва. Было пашкоджана і выведзена са строю 560 рэек. З ліку камсамольцаў-партызан выраслі дзесяткі майстроў дыверсійна-падрыўной справы. На баявым рахунку маладых падрыўнікоў Леаніда Серафімовіча 32 пушчаныя пад адхон варожыя эшалоны, Леаніда Караткевіча — 12, Рыгора Чавуса — 10.

У канцы верасня 1943 г. нямецкая акупацыйная адміністрацыя прыняла рашэнне аб перадыслакацыі паліцэйскіх гарнізонаў з Брагіна і Хойнік у Петрыкаў. Маршрут пралягаў праз Мазырскі раён: Слабаду, Белую, Скрыгалаў. Камандаванне Мазырскай партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага прыняло рашэнне разграміць гэтыя варожыя фарміраванні. Была зроблена засада на дарозе паміж вёскамі Слабада і Белая. Група партызан на чале з Прусам знішчыла каля 20 чалавек, а ў раёне вёсак Майсееўка і Хамічкі, куды адступіў праціўнік, было забіта 40 гітлераўцаў. Асабліва вызначыліся партызаны, якіх у бой вёў член Мазырскага падпольнага райкама ЛКСМБ В. Д. Лук'яновіч. Вораг быў рассеяны і не дайшоў да месца новай дыслакацыі.

Восенню 1943 г. народныя мсціўцы Мазыршчыны сталі фактычна гаспадарамі на сваёй тэрыторыі.

Камандаванне Мазырскай брыгады, падпольныя райкамы партыі і камсамола праводзілі вялікую работу па разлажэнні варожых фарміраванняў. Да 15 жніўня 1943 г. на тэрыторыі Мазырскага раёна, за выключэннем мясцовай, а таксама краснадарскай і харкаўскай паліцыі, якія адступалі разам з



Радыст Мазырскай партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага Г. А. Бабін вядзе радыёперадачу

немцамі, ніякіх фарміраванняў не было. З другой палавіны жніўня пачалі прыбываць часці так званай РОА (уласаўцы). У гэтыя часці стала засылацца літаратура, наладжваліся асабістыя кантакты на розных узроўнях. У выніку да партызан з гэтых часцей перайшло са зброяй 60 чалавек. Частка збегла без зброі. На бок народных мсціўцаў перайшлі са зброяй і 11 мясцовых паліцэйскіх.

Агітацыйная работа давала свае вынікі і ў фарміраваннях гітлераўскіх саюзнікаў. 16 верасня 1943 г. з прудкоўскага гарнізона была прыведзена ў атрад група румын, а ў лістападзе на бок народных мсціўцаў перайшло 10 сербаў з рабочага батальёна 7-й венгерскай дывізіі. Салдаты і афіцэры славацкай дывізіі пераходзілі да партызан цэлымі групамі. Першымі славакамі, якія перайшлі на бок мазырскіх партызан яшчэ вясной 1943 г., былі Павел Зэлінка, Ян Яворчык, Ян Зэлінка, Стэфан Шверцал, Андрэй Мажэрык, Марцін Мігорчак і іншыя. 10 красавіка ў атрад быў прыведзены начальнік сувязі славацкай дывізіі Ян Газуха, які пазней быў перапраўлены за лінію фронту ў чэхаславацкую вайсковую часць Людвіка Свабоды. Славак Штэфан Шверцал і беларус Даніла Карасёў сталі неразлучнымі сябрамі, трапнымі кулямётчыкамі. Частка славакаў, якая перайшла на бок Мазырскай брыгады, была накіравана ў партызанскі атрад Яна Налепкі, пазней удастоенага высокага звання Героя Савецкага Саюза.

Асабовы склад Мазырскай партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага быў сапраўды інтэрнацыянальны. Выдатна зарэкамендавала сябе група падрыўнікоў, у якую ўваходзілі славакі Я. Зэлінка, П. Зэлінка, Я. Яворчык і беларусы Павел Доўгі, Кірэй Здрок і іншыя. Пры іх удзеле з красавіка 1943 па студзень 1944 г. на чыгунцы Мазыр — Оўруч было падарвана 10 варожых эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай, а ў перыяд блакады — 59 аўтамашын з гітлераўцамі.

Мазырская партызанская брыгада цесна ўзаемадзейнічала з народнымі мсціўцамі суседняга Петрыкаўскага раёна. У маі 1943 г. з партызанскага атрада Балотнікава Петрыкаўскай брыгады была выдзелена ініцыятыўная група з 15 партызан на чале з А. І. Трухановічам і А. І. Шабалтасам. Яна была накіравана за Прыпяць для барацьбы з ворагам на тэрыторыі Глініцкага і Асавецкага, Скрыгалаўскага і Снядзінскага сельсаветаў. У складзе арганізатарскай групы былі камуністы А. П. Васкевіч — старшыня Глініцкага сельсавета, жыхар вёскі Турбінка, А. М. Беняк — старшыня калгаса ў вёсцы Асавец.

Пад кіраўніцтвам палітрука А. І. Шабалтаса народныя мсціўцы разгарнулі агітацыйную работу сярод насельніцтва вёсак Асавец, Глініца, Скрыгалаў, Турбінка і іншых. Мясцовыя жыхары сталі актыўна папаўняць арганізатарскую групу, якая ўжо ў пачатку ліпеня перарасла ў партызанскі атрад колькасцю ў 135 чалавек. Яму быў прысвоены нумар 136. Камандзірам атрада быў прызначаны Андрэй Іванавіч Трухановіч, камісарам — Андрэй Іванавіч Шабалтас, начальнікам штаба — Фёдар Данілавіч Палазнік.



Ян Налепка

У ліпені 1943 г. атрад прыняў бой з нямецкай карнай экспедыцыяй. Па дарогах Глініцкага і Асавецкага сельсаветаў гітлераўцы рухаліся невялікімі групамі, з засад іх сустракалі народныя мсціўцы. 28 ліпеня група партызан з 13 чалавек зрабіла засаду на дарозе Скалодзін – Асавец. Праціўнік страціў 5 чалавек забітымі. 2 жніўня 1943 г. партызаны пад камандаваннем А. І. Шабалтаса выйшлі на дарогу Асавец – Асавецкая Буда і абстралялі праціўніка. Вораг страціў 6 чалавек забітымі.

Толькі ў засадах, праведзеных з 25 ліпеня па 10 жніўня 1943 г., партызаны атрада № 136 знішчылі 4 грузавыя і адну легкавую аўтамашыны. Пад іх абломкамі і ад куль партызан загінуў 41 гітлеравец. Дзве аўтамашыны з боепрыпасамі і адна легкавая падарваліся на партызанскіх мінах. Загінула 12 гітлераўцаў. Былі знішчаны 2 параконныя фурманкі з 11 варожымі салдатамі. Паспяховыя дзеянні атрада паднялі аўтарытэт народных мсціўцаў сярод мясцовага насельніцтва. Яно дапамагала атраду прадуктамі, адзеннем, зброяй і боепрыпасамі, вяло разведку. Мясцовыя жыхары перадалі партызанам 30 вінтовак, 2 пісталеты, вялікую колькасць патронаў, 48 гранат.

Дыверсійна-падрыўная група атрада ў асноўным пускала пад адхон цягнікі ворага на чыгунцы Брэст – Гомель. Так, 30 жніўня 1943 г. група падрыўнікоў атрада на чале з камандзірам аддзялення Міхаілам Макаравічам Галіцкім замініравала чыгуначнае палатно паміж станцыямі Пціч і Каржоўка. Але ў гэту ноч варожыя цягнікі не пайшлі. Раніцай групе нямецкіх вартавых удалося заўважыць міну. На месца прыбыў, відаць, адказны за ахову чыгункі фашысцкі генерал-маёр. Ён пачаў тлумачыць падначаленым, як абясшкодзіць міну. У гэты час адзін з партызан туза-



Партызаны атрада імя Варашылава перад выхадам на заданне. Стаяць (трэці злева) С. П. Ракіцкі, чацвёрты – С. П. Раднеўскі, чацвёрты справа – К. М. Бакун



Камісары Мазырскай і Лельчыцкай партызанскіх брыгад М. К. Ільінкоўскі і Р. А. Лін на сустрэчы ў Мазырскіх лясах

нуў замаскіраваны шнур. Адбыўся выбух. У выніку было забіта 18 і паранена 7 ворагаў. Быў забіты і генерал, якога павезлі хаваць у Германію.

Камсамолец Васіль Піскун пусціў пад адхон 3 варожыя эшалоны.

Падрыўнікі атрада А. І. Трухановіча падарвалі 7 варожых эшалонаў з markzнымі грузамі і жывой сілай. Было разбіта 89 вагонаў. Праціўнік страціў пры гэтым 315 салдат і афіцэраў забітымі і 213 параненымі, 6 танкаў і 45 аўтамашын. Эшалон з жывой сілай, тэхнікай і гаручым пусціў пад адхон Дзяніс Радаўня, а камсамолка Ліда Дубіна на чыгунцы падарвала 2 рэйкі. Усяго па праграме «рэйкавай вайны» партызаны атрада падарвалі 205 чыгуначных рэек.

Не хапала выбуховых матэрыялаў. Трэба было іх здабываць, прыстасоўваць бомбы і снарады пад міны. З рызыкай для жыцця падрыўнікі выплаўлялі з іх выбуховыя рэчывы і канструявалі самаробныя міны. Але гэтага было недастаткова.

Вялікую ўвагу камандаванне атрада ўдзяляла разведцы, якая дзялілася на агентурную і ўнутраную. Яна вялася як у зоне дыслакацыі атрада, так і ў аддаленых варожых гарнізонах. Разведданыя перадаваліся камандаванню Петрыкаўскай і Мазырскай брыгад.

Праблемай для камандавання было медыцынскае абслугоўванне і забеспячэнне атрада. Медыцынскую службу ў ім узначальвала ўрач Генаэфа Пятроўна Лапета. Яна вылечыла і вярнула ў строй некалькі цяжка параненых партызан. Трох параненых прыйшлося адправіць для далейшага лячэння ў савецкі тыл. Многія партызаны хварэлі на тыф. Але медслужба атрада здолела іх вылечыць. Медыкаментамі атрад забяспечвалі ў асноўным падпольшчыкі. Начальніку штаба атрада Ф. Д. Палазніку ўдалося ўстанавіць кантакт з ветурачом Гебісам, які служыў у немцаў у Петрыкаве. Ён перадаў многа лякарстваў.

Восенню 1943 г. пачалося вызваленне Гомельскай і Палескай абласцей. Гітлераўскае камандаванне цяпер надавала вялікае значэнне Мазыру — апорнаму пункту на Прыпяці. Тут яно планавала стварыць глыбока эшаланіраваную абарону. У Мазыр і на станцыю Калінкавічы былі дадаткова сцягнуты войскі. Аб прыбыўшых вайсковых часцях і перамяшчэннях жывой сілы і тэхнікі праціўніка аператыўна паведамлялі партызанскаму камандаванню мазырскія падпольшчыкі. Затым гэтыя звесткі неадкладна перадаваліся за лінію фронту.

Імкнучыся зрабіць больш надзейным свой тыл, гітлераўцы арганізавалі карныя вылазкі супраць партызанскіх фарміраванняў, у тым ліку і супраць Мазырскай партызанскай брыгады. 30 снежня 1943 г. супраць партызан з вёскі Слабада выступіў карны атрад СС колькасцю 150 чалавек. Камандзір 1-га партызанскага атрада А. Д. Колас зрабіў засаду ў лесе непадалёку ад перакрыжавання дарог на вёскі Белая, Надаткі, Раманаўка, Казіміраўка. Страціўшы 20 чалавек забітымі і параненымі, праціўнік вымушаны быў вярнуцца ў Слабаду.

З пачаткам вызвалення савецкімі войскамі тэрыторыі Беларусі перад

падпольшчыкамі, партыйнымі органамі, партызанскімі атрадамі і брыгадамі, якія дзейнічалі ва ўсходніх абласцях рэспублікі, паўсталі новыя задачы па арганізацыі цеснага ўзаемадзеяння з савецкімі войскамі і аказанні ім усебаковай і эфектыўнай дапамогі. У гэты час пры штабе 61-й арміі Беларускага фронту была створана аператыўная група Палескага абкама партыі.

2 снежня 1943 г. прамы кантакт з 1321-м стралковым палком, якім камандаваў падпалкоўнік Алейнік, устанавіла Мазырская партызанская брыгада. Камандаванне палка выдзеліла брыгадзе боепрыпасы. Па заданні штаба 61-й арміі брыгада вяла разведку сістэмы абароны пярэдняга краю праціўніка, размяшчэння яго агнявых кропак, колькасці войск. Народныя мсціўцы ўзялі ў палон чатырох гітлераўцаў і ў якасці «языкоў» перадалі вайсковаму камандаванню.

Для дапамогі савецкім войскам у ажыццяўленні паспяховага наступлення камандаванне Мазырскай брыгады накіравала ў вёску Выступовічы Оўручскага раёна суседняй Украіны 80 праваднікоў, якія добра ведалі раён, горад Мазыр і яго ваколіцы. Камандзір Мазырскай партызанскай брыгады А. Л. Жыльскі разам з камандаваннем наступаючых войск удзельнічаў у распрацоўцы плана абходнага манеўра на Мазыр. Ваенны савет 61-й арміі пасля аналізу партызанскіх разведданых прыняў рашэнне — пры дапамозе партызан непрыкметна прасачыцца ў тыл ворага двум кавалерыйскім карпусам і разам з партызанамі разграміць мазырскую групоўку праціўніка.

8 студзеня 1944 г. два атрады Мазырскай партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага злучыліся ў вёсцы Іванкаўшчына Мазырскага раёна з часцямі 7-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса. 3-ці атрад брыгады злучыўся з часцямі 2-га кавалерыйскага гвардзейскага корпуса. Партызанская брыгада забяспечыла армейскае камандаванне дакладнымі разведданымі.

2-гі атрад брыгады сумесна з часцямі 16-й гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі пад камандаваннем генерал-маёра Р. А. Бялова ўдзельнічаў у вызваленні вёсак Слабада, Слабодка, Хамічкі, Барыскавічы і Прудок.

Пасля вызвалення Мазыра баявое ўзаемадзеянне часцей Чырвонай Арміі і мазырскіх партызан не спынялася. Так, 16 студзеня 1944 г. 2-гі атрад сумесна з воінскімі часцямі наступаў на захад да мяжы Петрыкаўскага раёна. К канцу дня 15 студзеня атрад самастойна авалодаў вёскай Перадрэйка Асавецкага сельсавета і ўтрымліваў яе да падыходу савецкіх войск.

1-шы і 2-гі атрады брыгады дзейнічалі сумесна з часцямі Чырвонай Арміі да 18 студзеня 1944 г. 3-ці атрад разам з 10-м і 12-м палкамі 2-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса ўдзельнічаў у вызваленні вёсак Скрыгалаў і Асавец. Партызаны забяспечылі ваеннае камандаванне дакладнымі разведданымі, былі праваднікамі воінскіх часцей. Атрад разам з вайсковымі падраздзяленнямі ўдзельнічаў у фарсіраванні Прыпяці. Баявое ўзаемадзеянне атрада і вайскоўцаў працягвалася да 20 студзеня 1944 г.

За актыўную дапамогу воінскім часцям у баях за вызваленне Мазыра і раёна асабоваму складу Мазырскай партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага камандуючы 61-й арміяй генерал-лейтэнант П. А. Бялоў аб'явіў падзяку.

Пасля вызвалення раёна выйшлі з падполля Мазырскі райкам партыі і райкам камсамола. Да 20 студзеня 1944 г. былі расфарміраваны атрады Мазырскай партызанскай брыгады, якая на дзень злучэння з Чырвонай Арміяй налічвала звыш 500 партызан і партызанак. Большая частка іх папоўніла падраздзяленні 61-й арміі.

Былі падведзены баявыя вынікі дзейнасці брыгады за час яе барацьбы ў тыле ворага. Народныя мсціўцы сумесна са злучэннем А. М. Сабурава падарвалі 15 варожых эшалонаў з жывой сілай і грузамі ваеннага прызначэння.

Было выведзена са строю 16 паравозаў, 99 вагонаў і платформаў, знішчаны танк, бронемашына, 58 аўтамашын, забіта 1698 салдат і афіцэраў праціўніка, звыш 900 паранена. Падарваны 584 чыгуначныя рэйкі, спалены 19 мастоў, разгромлены 2 варожыя гарнізоны і 12 маслапунктаў, што працавалі на акупантаў. У якасці трафеяў партызаны ўзялі ў баях з гітлераўцамі 17 ручных кулямётаў, 85 аўтаматаў, 265 вінтовак, 300 тыс. патронаў і г. д.

*А. Васько*

## Воін, падпольшчык, партызан

**Языковіч Фёдар Міхайлавіч** (н. 5.2.1903). З 1924 г. працаваў настаўнікам, інспектарам, загадчыкам райана ў Магілёўскай і Мінскай абласцях, быў на прафсаюзнай, культурна-асветніцкай рабоце. У 30-я гады—дырэктар Рэспубліканскай школы старшынь калгасаў, інструктар ЦК КП(б)Б, а з 1939 г.— загадчык аддзела, другі сакратар Палескага абкама КП(б)Б. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны — адзін з першых арганізатараў падпольнай і партызанскай барацьбы на Мазыршчыне. Потым быў камісарам кавалерыйскай групы, камісарам дывізіі на Цэнтральным, Паўднёва-Заходнім і Бранскім франтах. З лістапада 1942 г.— упаўнаважаны ЦК КП(б)Б па Палескай вобласці, у 1943 г.— першы сакратар Палескага падпольнага абкама КП(б)Б, камандзір Палескага партызанскага злучэння. Загінуў 7.4.1943 г. каля станцыі Старушкі. Пахаваны ў Мазыры на Кургане Славы. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга.

Імя Ф. М. Языковіча прысвоена мазырскай сярэдняй школе № 5, вуліцам у Мазыры і Калінкавічах, у г. п. Акцябрскім. На месцы гібелі паміж чыгуначнымі станцыямі Брынёў і Старушкі ўстаноўлены абеліск, на будынку чыгуначнай станцыі Старушкі — мемарыяльная дошка.

Ф. М. Языковіч



Па ініцыятыве Фёдара Міхайлавіча быў распрацаваны і ажыццёўлены шэраг буйных баявых аперацый. Як і намячалася, асноўныя дзеянні партызанскіх атрадаў Палескага злучэння канцэнтраваліся на камунікацыях ворага. На чыгунцы Лунінец—Гомель з 76 прайшоўшых за сакавік 1943 г. у бок фронту воінскіх эшалонаў 20 пусцілі пад адхон, узарвалі 13 мастоў на шасэйных дарогах і чыгунцы, разграмілі два гарнізоны ворага, 3 валасныя ўправы...

Ва ўсіх справах і пачынаннях Фёдара Міхайлавіча адчувалася рука вопытнага баявога камандзіра і ўмелага партыйнага работніка. Высокая патрабавальнасць і выключная прынцыповасць у адносінах да падначаленых спалучаліся ў ім з патрабавальнасцю да самога сябе, з жаданнем унікнуць ва ўсё самому, імкненнем да тонкасці ведаць і адчуваць настрой таварышаў па зброі. Абстраляны ў франтавых баях ваенны камісар, мужны і рашучы, ён лічыў сваім абавязкам знаходзіцца побач з байцамі — партызанамі ў самыя цяжкія моманты бою. Так было і ў той дзень, 7 кастрычніка 1943 г. Аперацыя па разгроме варожага эшалона са зброяй ля раз'езда Брынёў на чыгуначнай лініі Брэст — Гомель падыходзіла да канца, калі варожая куля абарвала жыццё адважнага камандзіра. Яму тады споўнілася толькі 40 гадоў...

*П. Панамарэнка*

З кнігі: Секретарь обкома. Воспоминания и документы о Ф. М. Языковиче. Мн., 1982.

## Яны былі першымі

**Ветраў Іван Дзмітрыевіч** (н. у 1905) перад вайной працаваў пракурорам Беларускай ССР, быў членам ЦК КП(б)Б і дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР першага склікання. Пасля акупацыі фашысцкімі захопнікамі Беларусі пайшоў на фронт, удзельнічаў у абароне Масквы. У канцы 1941 г. быў накіраваны ў распараджэнне ЦК КП(б)Б, выконваў заданні Беларускага штаба партызанскага руху. Са жніўня 1943 г. і да вызвалення Палесся быў першым сакратаром Палескага падпольнага абкама партыі і камандзірам злучэння партызанскіх атрадаў гэтай жа вобласці. Аўтар кнігі «Братья по оружию». Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны, многімі медалямі.



І. Д. Ветраў



М. І. Макаранка

## З успамінаў І. Д. Ветрава

Лишь три месяца в 1941 г. действовал Мозырский партизанский отряд. Трагическая, в то же время героическая, была последующая судьба его командования, некоторых других партизан.

Недостаток фактов о жизни и деятельности подпольного райкома партии, командира отряда Максима Игнатьевича Макаренко, его соратников не позволил мне в книге «Братья по оружию», вышедшей в 1965 г., рассказать о них. Лишь позже, благодаря воспоминаниям оставшихся в живых партизан отряда, документам архива, свидетельствам семьи Макаренко, удалось восстановить картину суровой партизанской борьбы в первые месяцы оккупации района фашистами.

...В тридцатые годы Максим Макаренко работал на Гомельском хлебозаводе, затем в числе 25-тысячников приехал в деревню. Здесь он находился на посту председателя партийной ячейки, активно участвовал в создании колхозов. В начале 1941 г. Макаренко стал вторым секретарем Мозырского райкома партии.

Грянула война. Максим Игнатьевич был назначен секретарем Мозырского подпольного райкома партии. Он формировал истребительные отряды по борьбе с вражескими диверсантами, организовывал эвакуацию имущества предпрятий, колхозов и совхозов в глубь страны, подбирал людей для подпольной работы. В лесах Мозырщины закладывались партизанские базы, действовали истребительные группы, которые вели охрану важнейших объектов города и района.

Партизанский отряд в составе 50 человек под командованием Макаренко, который базировался в Казимировских лесах, начал боевые действия в августе 1941 г. К сожалению, он просуществовал недолго. Фашистам удалось нанести ряд чувствительных ударов, захватить базы в урочище Чертень и других местах. Партизаны были вынуждены действовать мелкими группами. По-разному сложились их судьбы. Ф. Д. Козлов и И. Я. Черняк пробрались в Брянские леса, где сражались с фашистами. П. М. Лузан со своей группой подался к ельским партизанам. Некоторые группы ушли за линию фронта. В их составе и командир отряда М. И. Макаренко.

И только через 16 месяцев, 28 февраля 1943 г., в Мозырский район прибыла инициативная группа во главе с А. Л. Жильским и М. К. Ильинковским, посланная Полесским подпольным обкомом партии. За два месяца эта группа выросла в партизанский отряд в 150 человек. Не прекращались диверсии и в самом Мозыре. Здесь действовало несколько подпольных групп. Так, Мирон Устинович Чищеня до войны работал сторожем в райкоме, жил на берегу Припяти на Пролетарской улице. Райком партии оставил его в подполье. Наблюдая за передвижением фашистов по реке и переправе через Припять, он передавал ценную информацию своим людям.

Не могу не сказать о судьбе командования отряда. С горечью вспоминаю трагическую гибель секретаря парторганизации отряда Федора Афанасьевича Каменского, работавшего перед войной заместителем председателя Мозырского райисполкома. По доносу предателей фашистские изверги схватили его, привязали за ноги к телеге и долго таскали по улицам, а потом расстреляли. Комиссару отряда П. И. Счеславскому удалось избежать ареста и уйти с Е. М. Вольковской в Могилевскую область, где они вступили в бригаду «Чекист». Там Счеславский выполнял обязанности комиссара 1-го отряда и погиб 16 мая 1944 г. Похоронен он в д. Заозерье Белыничского района.

Максим Игнатьевич Макаренко перешел линию фронта и некоторое время находился в Москве в распоряжении ЦК КП(б)Б. В марте 1942 г. он в составе диверсионной группы был направлен в тыл врага с боевым заданием и погиб при минировании железной дороги...

## ПАРТЫЗАНСКАЕ ЗЛУЧЭННЕ ПАЎДНЁВА-ПРЫПЯЦКАЙ ЗОНЫ

### Мазырская брыгада імя Аляксандра Неўскага (1943)

Создана 28 сентября 1943 г. по решению командования двух партизанских отрядов, действовавших в Мозырском районе. Одновременно в бригаде был организован третий отряд.

Бригада действовала в Мозырском, Петриковском и Ельском районах.

Соединились с частями Красной Армии 8 января 1944 г. в составе 3 отрядов общей численностью 500 партизан.

| | | |
|---|---|---|
| Из них: | мужчин — 472 | других нац. — 30 |
| | женщин — 28 | членов ВКП(б) — 31 |
| | белорусов — 429 | кандидатов — 31 |
| | русских — 32 | членов ВЛКСМ — 96 |
| | украинцев — 9 | беспартийных — 342 |

| | |
|---|---|
| Командир бригады — Жильский Александр Лукич | сентябрь 1943 — январь 1944 |
| Комиссары: Ильинковский Михаил Кузьмич | сентябрь 1943 — декабрь 1943 |
| Кирюшкин Николай Сергеевич | декабрь 1943 — январь 1944 |
| Начальник штаба — Заборов Михаил Алексеевич | сентябрь 1943 — январь 1944 |

#### 1-й отряд

Образован в феврале 1943 г. на базе инициативной группы (12 чел.), выделенной в соответствии с указанием Полесского подпольного обкома КП(б)Б Ельским отрядом.

На день соединения с частями Красной Армии насчитывал 157 партизан.

| | |
|---|---|
| Командиры отряда: Жильский Александр Лукич | февраль 1943 — сентябрь 1943 |
| Колос Андрей Данилович | сентябрь 1943 — январь 1944 |
| Комиссары: Ильинковский Михаил Кузьмич | февраль 1943 — сентябрь 1943 |
| Гончар Александр Семенович | сентябрь 1943 — январь 1944 |
| Начальники штаба: Заборов Михаил Алексеевич | февраль 1943 — сентябрь 1943 |
| Каменский Кузьма Данилович | сентябрь 1943 — январь 1944 |

#### 3-й отряд

Организован в июне 1943 г. на базе инициативной группы (15 чел.), выделенной 1-м отрядом. До 28 сентября 1943 г. назывался 2-й.

На день соединения с частями Красной Армии насчитывал 142 партизана.

| | |
|---|---|
| Командиры отряда: Власенко Иван Михайлович | июнь 1943 — август 1943 |
| Мишура Александр Родионович | август 1943 — январь 1944 |
| Комиссар — Лузан Петр Макарович | июнь 1943 — январь 1944 |
| Начальник штаба — Лузан Петр Леонтьевич | сентябрь 1943 — январь 1944 |

#### 2-й отряд

Сформирован 28 сентября 1943 г. из личного состава, выделенного 1-м и 3-м отрядами бригады.

На день соединения с частями Красной Армии насчитывал 166 партизан.

| | |
|---|---|
| Командир отряда — Потапов Мина Захарович | сентябрь 1943 — январь 1944 |
| Комиссар — Лукьянович Владимир Демьянович | сентябрь 1943 — январь 1944 |
| Начальник штаба — Власенко Иван Михайлович | сентябрь 1943 — январь 1944 |

*Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны 1941—1944. Мн., 1983. С. 660—662.*



М. З. Патапаў



У. Д. Лук'яновіч

## ПАРТЫЗАНСКІЯ ФАРМІРАВАННІ, ЯКІЯ НЕ ЎВАХОДЗІЛІ Ў СКЛАД ПАРТЫЗАНСКАГА ЗЛУЧЭННЯ ПАЛЕСКАЙ ВОБЛАСЦІ
**(дзейнічалі на тэрыторыі Мазырскага раёна)**

### Отдельный Петриковский отряд

Образован в июле 1941 г. на основании постановления Полесского обкома КП(б)Б от 23 июля 1941 г. из партийных, советских и комсомольских активистов Петриковского района. В конце августа — начале сентября 1941 г. в отряд влились диверсионно-разведывательная группа во главе с М. А. Головкиным, направленная в Петриковский район по заданию Военного совета Западного фронта, а также диверсионно-разведывательная группа Житковичского района и Житковичский партизанский отряд.

В октябре 1941 г. отряд был окружен карателями. По решению партийного собрания отряда 21 октября 1941 г. он разбился на группы и вышел за линию фронта. Основная его часть присоединилась к Добрянскому отряду Черниговской области, житковичские партизаны вернулись в свой район. Численный состав отряда на сентябрь 1941 г. — 120 чел.

Командир отряда — Гордиенко Василий Игнатьевич
Комиссар — Соколовский Станислав Иванович
Начальник штаба — Яворский

### Отдельный Махновичский отряд

Создан в августе 1941 г. в Махновичском сельсовете Ельского района из партийно-советского актива и местных патриотов. В начале октября 1941 г. в боях с противником отряд был рассеян, оставшаяся группа партизан (46 чел.) присоединилась к Кочищанскому отдельному отряду.

Командир отряда — Гончаренко Яков Федорович
Комиссар — Перлов Ефим Давыдович

### Отдельный Мозырский отряд

Организован в августе 1941 г. на основании постановления Полесского обкома КП(б)Б от 23 июля 1941 г. из партийно-советского актива Мозырского района и рабочих электростанции. В начале октября 1941 г. отряд был окружен карателями. По решению командования основная часть, разбившись на мелкие группы, вышла в советский тыл. В районе осталось 7 человек для проведения работы нелегально.

Командир отряда *Макаренко Максим Игнатьевич*
Комиссар *Счеславский Петр Игнатьевич*

*Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны 1941—1944. Мн., 1983. С. 666—668.*

## Камандны састаў Мазырскай партызанскай брыгады

**Жыльскі Аляксандр Лукіч** (н. 9(22).11.1909 у в. Мялешкавічы Мазырскага р-на) — адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Палескай вобласці.

У Чырвонай Арміі з 1931 г. У лістападзе 1941 г. накіраваны ў варожы тыл. У лістападзе 1942 — маі 1943 г. — камандзір партызанскіх атрадаў у Ельскім і Мазырскім раёнах, затым камандзір Мазырскай партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага. У 1944 — 1948 гг. — старшыня Мазырскага райвыканкама, з 1950 г. на савецкай рабоце ў Гомелі, Гомельскай вобласці.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, двума іншымі ордэнамі, медалямі.

**Ільінкоўскі Міхаіл Кузьміч** (н. 22.11.1903 у в. Дабрынь Ельскага р-на) — адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыйнага падполля і партызанскага руху ў Палескай вобласці.

З 1921 г. на педагагічнай і савецкай рабоце. Настаўнік і дырэктар сямігадовай школы ў в. Мялешкавічы, старшыня Ельскага райвыканкама. З жніўня 1941 г. у партызанах: камандзір і камісар атрада. У красавіку 1943 — студзені 1944 г. — сакратар Мазырскага падпольнага райкама КП(б)Б, адначасова ў верасні — снежні 1943 г. — камісар Мазырскай партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага.



А. Л. Жыльскі



М. К. Ільінкоўскі

Пасля вайны працаваў першым намеснікам старшыні Палескага, старшынёй Пінскага аблвыканкамаў, сакратаром Іванаўскага РК КП(б)Б, кіраўніком спраў Савета Міністраў БССР, у Міністэрстве гандлю.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, іншымі ордэнамі. Памёр у 1985 г.

М. К. Ільінкоўскі — аўтар кнігі «Ішла вайна народная». Невялікі ўрывак з яе прыводзіцца ніжэй.

...Командир отряда Александр Лукич Жильский молча склонился над картой. Десятки пометок на ней отмечали движение колонн немцев и их местонахождение. Вот-вот каратели сойдутся в Мелешковичах... Как будут действовать они дальше? Что предпринять партизанам? Все взводы, кроме одного, посланы в засады, откуда ведут наблюдение за гитлеровцами, минируют дороги и обстреливают вражеские машины.

Наконец последнее донесение вернувшихся разведчиков: каратели — в Мелешковичах. Двадцать три автомашины, в каждой больше двадцати солдат. Итого — около пятисот. Хуже того, судя по всему, они не собираются задерживаться в деревне и намерены немедленно начать наступление на лесные курени жителей.

Вокруг Жильского, ожидая приказания, уже собрались находившиеся в лагере командиры и часть партизан. Задумался командир. Надо бы ударить по врагу с тыла, да всего взвод под рукой...

— Разрешите предложить...

Лукич взглянул на Демидченко.

— Слушаю.

— Я со взводом быстро пройду к хутору Зеленка и, как только засада завяжет бой на подступах к лесу, ударю по карателям с тыла. Надо только, чтобы засада не слишком упорствовала: после первых же выстрелов отступала по опушке леса. Во-первых, гитлеровцы увяжутся за ней, пытаясь догнать или окружить, а мелешковцы тем временем смогут уйти подальше в чащу. Во-вторых, растянувшись или, еще лучше, разделившись на мелкие подразделения, немцы не смогут оказать организованное сопротивление нам. Я уверен, что они остановятся и даже отойдут назад.

— А как же наш лагерь, если гады сюда сунутся? — спросил кто-то из партизан.

— Здесь займет круговую оборону хозгруппа, — ответил за Демидченко командир отряда, явно одобряя этим внесенное предложение. И, обращаясь к Демидченко, добавил: — Сколько надо на подготовку?

— Взвод к выходу уже готов. Разрешите действовать?

— Действуй.

Все произошло именно так, как и предложил Демидченко. Утром следующего дня на опушке леса карателей встретила огнем засада. Потом она

начала медленно отходить. Обнаружив, что партизан совсем немного, гитлеровцы решили преследовать их, послав часть сил в обход. И когда им казалось, что победа вот-вот будет полной, раздались залпы демидченковского взвода. В задних цепях немцев появилась растерянность, затем они начали выходить из зоны обстрела.

Карательная экспедиция сорвалась...

## З ДАНЯСЕННЯ КАМАНДАВАННЯ АХОВЫ ТЫЛУ 2-Й НЯМЕЦКАЙ АРМИИ АБ ДЗЕЙНАСЦІ ПАРТЫЗАН І ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ І СТАНОВІШЧЫ Ў ТЫЛАВЫХ РАЁНАХ АРМІІ ЗА ПЕРЫЯД З 25 ВЕРАСНЯ ПА 20 КАСТРЫЧНІКА 1943 г.

З данясення № 1452 *25 верасня 1943 г.*

Только некоторые населенные крупные пункты (Речица, Брагин, Мозырь) управляются и контролируются немецкими учреждениями, а остальная территория находится под контролем партизан... Ограничиваемая лишь ж.-д. сообщением по линии Пинск — Гомель. Передвижение по шоссейным дорогам почти не осуществляется, причиной этого является то, что дороги во многих случаях заминированы, завалены, мосты разобраны, сожжены или взорваны. В сырую погоду временные объезды использовать нельзя...

*Всенародное партизанское движение... Т. 2, кн. 2. С. 344.*

## З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ Ў ЦК КП(б)Б САКРАТАРА ПАЛЕСКАГА ПАДПОЛЬНАГА АБКАМА І. Д. ВЕТРАВА «О ПОДБОРЕ ПАРТИЗАНСКИХ КАДРОВ, БОЕВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ И МАССОВО-ПОЛИТИЧЕСКОЙ РАБОТЕ СРЕДИ ПАРТИЗАН И НАСЕЛЕНИЯ ОБЛАСТИ ЗА ПЕРИОД С 1 АВГУСТА ПО 1 НОЯБРЯ 1943 г.»

*5 лістапада 1943 г.*

...В области регулярно (два раза в неделю) выходит областная газета «Большевик Полесья» средним тиражом 500 экз. За отчетный период ОК КП(б)Б издано 5 листовок общим тиражом 6 тыс. экземпляров.

...Областная и районные газеты, а также листовки, издаваемые ОК КП(б)Б и РК КП(б)Б, распространяются во всех районных пунктах области, включая гор. Мозырь и Калинковичи, Туров и Петриков и немецко-полицейские гарнизоны. Среди населения распространено большое количество литературы, полученной из Москвы (центральные и республиканские газеты и журналы, брошюры и листовки и т. д.). Спрос на литературу колоссален, газеты переходят из рук в руки, зачитываются до дыр... В г. Мозырь гитлеровцы произвели массовые аресты в поисках типографии газеты «Большевик Полесья».

Фашистские газетки «Новый путь» и «Мозырские известия», распространяемые в области, а также бесчисленное количество листовок, разбрасываемых немцами с самолетов, вызывают у трудящихся только насмешки и никаким авторитетом не пользуются. Население безгранично верит сообщениям Советского информбюро и ежедневно слушает и читает их с исключительным вниманием...

Секретарь Полесского подпольного обкома КП(б)Б *И. Ветров*

*Всенародное партизанское движение... Т. 2, кн. 2. С. 407—415.*

## У імя перамогі

### З успамінаў К. М. Бакуна, былога начальніка штаба Палескага партызанскага злучэння

Упершыню я сустрэўся з мазырскім падпольшчыкам Д. А. Казлоўскім у кастрычніку 1941 г. Мы намецілі мерапрыемства па актывізацыі дзейнасці, абгаварылі сувязь. Другая сустрэча з Казлоўскім і А. С. Мураўёвым адбылася ў памяшканні школы па вуліцы Камсамольскай, абмяркоўвалі канкрэтнае пытанне аб умацаванні падполля горада. На нарадзе ў доме № 114 па Пралетарскай вуліцы, дзе прысутнічалі мазырскія і калінкавіцкія падпольшчыкі Казлоўскі, Катлінскі, Талкачоў, Казарэз, Ракіцкі, Дзячэнка, Драбіца, вырашылі пытанне аб падрыхтоўцы лю-



К. М. Бакун

дзей да партызанскай барацьбы, збору зброі.

У раёне вёсак Міхалкі і Барбароў у пачатку вайны Мазырскім райвыканкамам былі закладзены базы для партызанскіх атрадаў. Казлоўскаму, Талкачову, Казарэзу, Ракіцкаму было даручана адшукаць іх, але гэта ўдалося значна пазней. У Калінкавіцкім раёне, ва ўрочышчы Новая Зямля, падпольшчыкі Ляўко, Камароў, Лядвіг, Талкачоў адшукалі 60 вінтовак, 2 ручныя кулямёты, 2 аўтаматы і шмат боепрыпасаў.

Я разам з Талкачовым быў накіраваны для сувязі з партызанскім атрадам Ф. І. Паўлоўскага, які дзейнічаў у Капаткевіцкім і Акцябрскім раёнах. Дамовіліся аб арганізацыі партызанскіх атрадаў у Калінкавіцкім і Мазырскім раёнах, аб каардынацыі іх дзеянняў.

У маі 1942 г. пачаў сваю дзейнасць партызанскі атрад. З Мазыра ў лес пайшлі Казлоўскі, Талкачоў, Ракіцкі, Марозаў. 12 чэрвеня атрад ажыццявіў першую баявую аперацыю на чыгунцы. Аб часе выхаду эшалона ворага нам паведаміў чыгуначны майстар з Калінкавіч І. В. Змушка, ён узброіў нас лапай і ключом. Выслабанілі рэйку, прывязалі да яе трос, схаваліся. Гэта было на павароце чыгункі на перагоне Галевіцы – Нахаў. Перад самым паравозам тросам рэйку сцягнулі з палатна. Цягнік пайшоў пад адкос. Разбіты паравоз, 16 пасажырскіх і 19 таварных вагонаў, забіта і паранена шмат гітлераўцаў. У гэтай аперацыі прымалі ўдзел Казлоўскі, Талкачоў, Аўдзяйчук, Марозаў, Глега, Шкарадзік, Трафім Кукса.

Мы разграмілі ў той час паліцэйскія гарнізоны ў Міхалках і Мялешкавічах, знішчылі маслазавод, у Каменцы разбурылі сепаратарны пункт, разагналі паліцэйскіх, на дарозе Оўруч – Мазыр знішчылі 2 варожыя аўтамашыны.

Заўсёды абапіраліся на мясцовых патрыётаў. У Каменцы жыў падпольшчык Рудніцкі з жонкай, яны забяспечвалі нас не толькі каштоўнымі звесткамі аб праціўніку, але і медыкаментамі. У вёсцы Тварычаўка дапамагаў Аўдзяйчук, у Мазыры па вуліцы Кімбараўка жыла наша сувязная Я. Бінецкая, якая перадавала звесткі ад падпольшчыкаў горада, дапамагала перапраўляць цераз Прыпяць папаўненне. Сувязныя М. Маргунова, М. Лянкевіч, Т. Есьман, Г. Родэ таксама здабывалі для нас каштоўныя звесткі аб ворагу.

Калі загінуў начальнік штаба атрада Леанід Лаеўскі і гітлераўцы захапілі ў яго дакументы атрада, Г. Родэ, атрымаўшы дакументы для перакладу (яна па заданні партызан працавала перакладчыцай у немцаў), частку іх знішчыла, частку перадала ў атрад, а з астатніх зрабіла недакладны пераклад, чым выратавала не адну партызанскую сям'ю. Л. Лаеўскі разам з ад'ютантам камандзіра Я. Талкачовым загінулі ў няроўным баі 15 верасня 1942 г.

Народныя мсціўцы працягвалі нарошчваць удары па ворагу. 5 ліпеня 1942 г. была ўзарвана электрастанцыя ў Калінкавічах. У гэтай аперацыі ўдзельнічалі С. П. Ракіцкі, Р. А. Чавус, Я. Талкачоў. У 1942 г. група партызан, у складзе якой былі Ракіцкі і Аўдзяйчук, захапіла на дарозе Калінкавічы – Мазыр каля паўтара мільёна марак. Частка іх была пераслана ў Маскву, на астатнія грошы партызаны куплялі ў славакаў зброю і выбуховыя матэрыялы.

У пачатку 1943 г. па ініцыятыве камандзіра Палескага партызанскага злучэння Ф. М. Языковіча былі накі-

раваны камандзіры для арганізацыі партызанскага злучэння Паўднёва-Прыпяцкай зоны: Бялянчык, Дзячэнка, Аўдзяйчук, Гаруля і іншыя. Быў створаны Мазырскі атрад. У рады народных мсціўцаў за два месяцы ўступіла больш як 100 чалавек, за кароткі час атрад перарос у брыгаду.

У 1943 г. атрад імя Варашылава прыняў актыўны ўдзел у «рэйкавай вайне». Лепшымі падрыўнікамі атрада былі С. Ракіцкі, М. Глега, Д. Казлоўскі, Р. Аўдзяйчук, К. Гаруля, Кукса, Марозаў, Шкарадзік і іншыя.

Да нас летам 1943 г. прыбыла разведгрупа Чырвонай Арміі капітана Быстрова. Рацыя і радыстка былі перапраўлены ў Мазыр з дапамогай сувязной Есьман на кватэру Катлінскага. Некалькі месяцаў Цэнтр атрымліваў з Мазыра каштоўную разведвальную інфармацыю. А ўжо недалёка было доўгачаканае вызваленне...

## Юнацтва маё баявое

**К. С. Гаруля** (н. у 1914 г. у в. Рудня Каменская Мазырскага р-на) у 1934 г. закончыў Слабадскую сямігодку, два гады працаваў у калгасе. У 1936—1938 гг. служыў у арміі, затым працаваў старшынёй калгаса ў роднай вёсцы. У гады нямецка-фашысцкай акупацыі — падпольшчык і партызан. Пасля вайны — на гаспадарчай рабоце. Працяглы час узначальваў калгас «Радзіма» Мазырскага р-на. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Памёр у 1993 г.

### З успамінаў К. С. Гарулі, былога сакратара Мазырскага падпольнага райкама ЛКСМБ

По рэкамендацыі ЦК КП(б) Беларусі ў пачатку вайны я быў накіраваны ў спецыяльную школу, якая рыхтавала арганізатараў народнай барацьбы ў тыле ворага. Праграма была паскораная. Да пачатку кастрычніка вучобу закончылі. І вось небяспечны шлях у тыл ворага. Я трапіў у раён Мазыра. Разам са мной былі жыхар вёскі Зімовішчы Мітрафан Колас і яшчэ некалькі чалавек. Падышлі да Мазырскага раёна ў пачатку снежня, пераправіліся з Коласам цераз Прыпяць.

У мяне была задача — устанавіць сувязь з падпольшчыкамі, але гэта ўдалося не адразу.

К. С. Гаруля



Праз некаторы час я звязаўся з Ц. Я. Абрамавым, М. Ф. Уласенкам, А. С. Мураўёвым і С. П. Ракіцкім. Яны дапамаглі звязацца з партызанамі.

Жыў я ў сваёй роднай вёсцы Рудня. На сувязь да мяне некалькі разоў прыходзіў мазырскі падпольшчык, затым партызан Калінкавіцкага атрада Р. А. Чавус і партызан Іван Шкарадзік. У чэрвені 1942 г. я з імі пайшоў у атрад імя Варашылава, створаны ў пачатку вайны мазырскімі і калінкавіцкімі падпольшчыкамі.

Мяне накіравалі ў дыверсійна-падрыўную групу, а праз некаторы час прызначылі яе камандзірам. Група складалася ў асноўным з камсамольцаў і моладзі. Падрыўной справе я навучыўся яшчэ ў школе ў 1941 г. Не хапала ўзрывчаткі. Часта дыверсіі на чыгунцы мы рабілі шляхам развядзення рэек. Выцягвалі кастылі, якімі рэйкі мацаваліся да шпалаў, прывязвалі трос да адной з іх і, калі цягнік падыходзіў зусім блізка, цягнулі за трос, рэйка адыходзіла, і эшалон звальваўся пад адхон. Калі міну немагчыма было падкласці, абстрэльвалі цягнік. Машыніст і ахоўнік хаваліся ад куль, я — бягом на палатно і падкладваў пад рэйкі міну націскнога дзеяння. Так было многа разоў.

...1 красавіка 1943 г. мяне выклікаў першы сакратар Палескага падпольнага абкама партыі Ф. М. Языковіч, які знаходзіўся ў лясах суседняга Капаткевіцкага раёна: «Вы прызначаецеся першым сакратаром Мазырскага падпольнага райкама камсамола. Гэта загад».

Трэба было шукаць мазырскіх партызан за Прыпяццю. Пераправіўся цераз раку з групай байцоў Калінкавіцкага атрада, якія ішлі на баявыя заданні. У Мялешкавіцкіх лясах сустрэў толькі што створаны Мазырскі атрад партызан, уручыў .пісьмо Ф. М. Языковіча камандзіру А. Д. Жыльскаму і камісару атрада М. К. Ільінкоўскаму. Апошні адначасова быў і сакратаром Мазырскага падпольнага райкама КП(б)Б. Яны абяцалі дапамогу ў камсамольскіх справах.

Адразу правялі атрадны камсамольскі сход, дзе мяне прадставілі моладзі. Пачалася баявая работа. Прыток несаюзнай моладзі ў атрад павялічваўся з кожным днём, быў укамплектаваны склад падпольнага райкама камсамола. Маладыя хлопцы, што праявілі сябе ў партызанскай і пад-

польнай барацьбе і мелі арганізатарскія здольнасці і аўтарытэт у моладзі — Рыгор Півавараў, Уладзімір Лук'яновіч, Яўсей Захаранка, Іван Уласенка і Мікалай Навуменка, сталі членамі Мазырскага падпольнага райкама камсамола.

У 14 вёсках раёна былі створаны падпольныя камсамольскія арганізацыі, якія налічвалі каля 60 маладых патрыётаў. Іх узначальвалі адважныя хлопцы і дзяўчаты Сяргей Жыльскі, Сяргей Басак, Соня Басак, Сяргей Ліс, Уладзімір Карабун, Валя Максімава і іншыя. Гэта быў наш баявы актыў, пры ўдзеле якога была здзейснена не адна баявая аперацыя.

Маладыя патрыёты вялі разведку гарнізонаў праціўніка, распаўсюджвалі сярод насельніцтва антыфашысцкую літаратуру і лістоўкі, выконвалі ролю сувязных, удзельнічалі ў баявых аперацыях.

## Замяніў бацьку

Восенню 1941 г. пры садзейнічанні бургамістра Мазырскага раёна М. Ю. Майсеева мой бацька Мікалай Уласенка быў прызначаны бургамістрам Каменкаўскай воласці. На гэтай пасадзе ён нямала карыснага зрабіў для партызан: забяспечваў прадуктамі, адзеннем, зброяй, медыкаментамі, інфармацыяй аб нямецкім гарнізоне ў Мазыры, наладжваў сувязі з падпольшчыкамі. Памятаю, ён прывозіў зброю з Мазыра — яе перадавала падпольная група В. І. Крыцкага. Зброя затым перапраўлялася ў атрад. Некалькі разоў ноччу да нас заходзілі партызанскія кіраўнікі К. М. Бакун, Р. А. Чавус, Д. А. Казлоўскі і іншыя.

Два разы бацька даручаў мне везці зброю ў вёску Аляксандраўка Ельскага раёна да Адама Уласенкі, які перапраўляў яе партызанам. Майсееў папярэджваў бацьку: «Мікалай, баюся я за твайго сына, малы ж яшчэ...» Вінтоўкі мы клалі на воз, зверху прыкрывалі сенам. Бацька папярэджваў: «Калі ў дарозе сустрэнуць фашысты і знойдуць зброю, уцякай, не стой на месцы. Каб не ўзялі жывым, а потым катавалі». На шчасце, усё абышлося добра.

Бадай што ва ўсіх вёсках Каменкаўскага сельсавета былі патрыёты, якія дапамагалі бацьку ў падпольнай рабоце. Помню Рыгора Шулярэнку, Марыю і Соф'ю Калацэй, Пятра Лузана, Русецкага, Паўла Жыльскага, Канстанціна Кашаля, Ядвігу Бінецкую, Івана Міцуру. Маці таксама дапамагала бацьку ў яго справах. Бацька разам з М. Ю. Майсеевым дапамагалі людзям пазбегнуць вывазу ў Германію. Спрыяў гэтаму фельчар каменкаўскай паліклінікі Мікалай Якаўлевіч Рудніцкі і яго жонка Соф'я Іванаўна, яны выдавалі даведкі аб хваробах.

На жаль, былі і здраднікі. Па даносу аднаго з іх бацька быў арыштаваны. Падпольшчыкам групы В. І. Крыцкага яго ўдалося вызваліць. Бацька дружыў з камандзірам славацкай вайсковай часці, якая дыслакавалася ў ваенным гарадку Козенкі. Ён нярэдка бываў у нас дома ў Каменцы, дружалюбна вёў гутаркі. Бацька гаварыў маці: «Калі мяне схопяць, звярніся да гэтага славацкага падпалкоўніка, ён дапаможа...»

Восенню 1942 г. гітлераўцы арыштавалі В. І. Крыцкага, М. Ю. Майсеева, І. А. Міцуру і іншых падпольшчыкаў. Пасля жорсткіх катаванняў фашысты іх расстралялі. Бацьку тэрмінова трэба было ісці ў партызаны. Каб не паставіць пад удар сям'ю, позняй восенню 1942 г. партызаны разыгралі сцэнарый прымусовага прыводу ў атрад. Я таксама хацеў пайсці, але мне сказалі: «Малы яшчэ... Памагай маці, прыйдзе твой час». Было мне тады 15 гадоў.

Бацька ваяваў у партызанскім злучэнні С. А. Каўпака. 12 сакавіка 1943 г. ён загінуў. А я ўсё-такі той вясной уступіў у Мазырскі партызанскі атрад, быў яго байцом да самага вызвалення раёна.

*А. Уласенка*

## АБ РАЗГРОМЕ МАЗЫРСКІМ ПАРТЫЗАНСКІМ АТРАДАМ СУМЕСНА З УКРАІНСКІМІ ПАРТЫЗАНАМІ ЗЛУЧЭННЯ А. САБУРАВА 30 ЖНІЎНЯ 1943 г. У в. ШЧАКАТАВА МАЗЫРСКАГА Р-НА ВАРОЖАГА ГАРНІЗОНА

*(Са справаздачы. Не пазней 21 лютага 1944 г.)*

Постоянную связь Мозырский партизанский отряд поддерживал с украинскими партизанами — соединением А. Н. Сабурова, находившимся в то время в соседнем Лельчицком районе. О гарнизонах противника в Мозырском районе Сабурову сообщалось ежедневно.

27 августа 1943 г. т. Сабуров с двумя ротами и взводом конников прибыл в населенный пункт Крушники. Командир отряда т. Жильский и зам. командира по разведке Кирюшкин прибыли к Сабурову с предложением о совместном разгроме одного из гарнизонов в Мозырском районе. Избрали гарнизон в д. Щекотова. Перед Мозырским партизанским отрядом была поставлена следующая задача: к 8.00 часам 28 августа 1943 г. дать подробные разведданные о силе и вооружении гарнизона в этой деревне.

...Одновременно в н. п. Крушники был намечен маршрут движения и конечный пункт сбора. Тут же были подсчитаны вооружение и силы партизан. В отряде из соединения Сабурова насчитывалось 250 человек и конный взвод в 40 человек из личной охраны. Вооружение: пушек 45 мм — 2, минометов ротных — 4, пулеметов ручных — 6, автоматов — 228, остальное — винтовки. В Мозырском партизанском отряде — 220 человек, вооружение: пулеметов ручных — 3, автоматов — 21, остальное — винтовки.

Путем опроса местных жителей дер. Щекотова разведка доложила, что гарнизон располагается в двух сараях западнее деревни (до 400 м), вокруг прорыты окопы. От военного городка Козенки проведена телефонная связь. Там же около сараев размещено 150 верховых лошадей. В д. Щекотова находится застава — 15 человек с винтовками и до 500 лошадей, на которых наложен карантин.

Сабуров и Жильский, получив данные о противнике гарнизона в Щекотове и в других населенных пунктах, совместно составили план наступления...

В 16.00 часов 19 августа 1943 г. Сабуров собрал командный состав, проверил готовность и отдал приказ...

1. Командиру первой роты автоматчиков выслать 30 чел. на дорогу из военного городка Козенки на Щекотову и в 3.00 часа 30 августа сделать засаду в 3 км от Щекотовы, заминировать дорогу минами для автомашины. В 3 час. 30 мин. порвать связь с Козенками.

2. Командиру Мозырского партизанского отряда т. Жильскому выделить 20 человек с винтовками (в качестве проводников), хорошо знающих населенный пункт Щекотову и окружающие деревни.

Группой в 40 человек (заслон от Слободы) руководил командир Мозырского отряда; группой в 30 человек (заслон от Козенок) руководил командир взвода группы автоматчиков соединения Сабурова, группой в 20 чел. (заслон от Рудни) руководил командир взвода Мозырского партизанского отряда, и главной ударной группой, до 400 чел., руководил помощник Сабурова.

К 4.00 30 августа все группы достигли намеченных рубежей и ожидали сигнала. В 4.00 Сабуров дал команду: «По городку Козенки двумя снарядами «Огонь!»

Фашистов, погрузившихся в глубокий сон, ошеломил оглушительный треск пулеметов, автоматов и винтовок, взрывы мин. Сараи, где они спали, загорелись. Гитлеровцы, успевшие выскочить в одном белье, под светом пожара расстреливались партизанами, подползшими к сараям на 20—30 метров.

Бой длился около 20 минут. Застава, находившаяся в Рудне, залезла в щели и не сделала ни единого выстрела. Только со стороны Щекотовы раздалось несколько ружейных выстрелов. Группа партизан до 15 человек с пулеметом подползла к конюшням в д. Щекотова и огнем уничтожила до 200 лошадей, остальные разбежались. Группа командира Мозырского отряда одновременно по сигналу открыла огонь по школе и прилегающему к ней дому в Слободе, в которых размещались немецкие вояки.

Противник пытался подбросить подкрепление из Козенок. Три автомашины с живой силой подорвались на минах, немецкие солдаты были обстреляны автоматным огнем, остальные пять машин с войском противника повернули обратно. Подобрав трофеи, в 4.55 был дан сигнал на отход (две зеленые ракеты).

Результаты операции: противник понес следующие потери — в гарнизоне Щекотова убито гитлеровцев 150 чел. По дороге Козенки — Щекотова уничтожено три автомашины, убито и ранено до 50 фашистов. В дер. Слобода убито 12 гитлеровцев. Трофеи: пулеметов ручных — 4, винтовок — 93, лошадей — 120, седел — 30, зерна в д. Слобода — 3 тонны...

Командир Мозырской партизанской бригады *Жильский*, комиссар партизанской бригады *Кирюшкин*, начальник штаба бригады *Заборов*

*Всенародное партизанское движение... Т. 2, кн. 2. С. 646—651.*



Помнік на месцы разгрому партызанамі нямецкага гарнізона ў в. Шчакатава

## Партызан Ян Зэлінка

У барацьбе з фашызмам разам з палескімі партызанамі ўдзельнічалі і грамадзяне краін Еўропы. Так і ў складзе брыгады імя Аляксандра Неўскага ваявала: сербаў — 20, славакаў — 12, румынаў — 1, фінаў — 1 чалавек... Аб гэтым сказана ў выніковай справаздачы камандавання брыгады ад 20 лютага 1944 г.

...Цёмнай красавіцкай ноччу 1943 г. пяцёра салдат-славакаў уцяклі з нямецкага гарнізона Козенкі. Яны прыйшлі ў партызанскі атрад. У сваёй зямлянцы перабежчыкаў сустрэў камандзір партызанскай брыгады Аляксандр Жыльскі.

— Пан вяліцель! З'явіліся ў ваша падпарадкаванне! — далажыў Ян Зэлінка.

— Добры дзень, сябры! — Моцна паціснуў руку кожнаму з іх камандзір. Завязалася цёплая размова.

У зямлянцы з'явіўся камандзір атрада Андрэй Колас, разведчыкі Мікалай Кірушкін і Дзмітрый Гаруля. Доўга размаўлялі, успаміналі, як славакі перадавалі партызанам медыкаменты, соль, зброю, боепрыпасы, звесткі аб праціўніку... Праз некалькі дзён славакі сталі членамі падрыўной групы, якую ўзначаліў партызан Павел Лузан.

...У цішыні цёмнай, ціхай красавіцкай ночы зрэдку ўспыхвалі асвятляльныя ракеты. Як не любілі іх партызаны! Павісне над галавою — быццам распранае.

— Наперад! — загадаў камандзір.

Ян Зэлінка, Вячаслаў Крыжаноўскі і Антон Качаноўскі папаўзлі да рэек і спрытна пачалі працаваць сапёрнымі лапатамі. Міна замаскіравана.

Хутка цішыню ночы ўзарваў моцны выбух. Дваццаць пяць вагонаў з боепрыпасамі і фашысцкай аховай паляцелі пад адхон...

Аперацыі на чыгунцы ў розных месцах адбываліся сістэматычна. Усе іх цяжка і пералічыць.

Пасля вайны Ян Зэлінка застаўся на Палессі, ажаніўся. Яго жонкай стала былая партызанская сувязная Лена. Разам вырасцілі дзяцей. Іван Іванавіч, як з павагай называлі Яна жыхары



Ян Зэлінка

Іванкаўшчыны, працаваў лесніком у Мазырскім лясгасе, быў у ліку лепшых. Наведваўся і на сваю далёкую радзіму — Славакію. Але цягнула на новую... Памёр Іван Іванавіч у кастрычніку 1978 г.

На новай радзіме, за якую ён ваяваў, якая стала яму па-сапраўднаму роднай, на якой, нарэшце, вырасціў дзяцей, яго памятаюць, часта ўспамінаюць Яна добрымі словамі баявыя сябры і жыхары Мазыршчыны.

*І. Цітоў*

## Жыхары Мазыршчыны, якія змагаліся ў партызанскіх атрадах і загінулі на тэрыторыі раёна і за яго межамі

Архівы Мінска, Кіева і Кішынёва даюць дакладныя звесткі аб удзеле жыхароў Мазыршчыны ў масавым партызанскім руху. Так, у Мазырскай партызанскай брыгадзе імя Аляксандра Неўскага з 500 чалавек каля 400 былі жыхарамі горада і раёна. 250 чалавек ваявалі ў Петрыкаўскай брыгадзе, 100 — у Ельскай, нямала мазыран былі партызанамі і ў суседніх раёнах...

19 лістапада 1942 года на Мазыршчыну ў раёне вёсак Аравічы — Барбароў цераз Прыпяць пераправіліся ўкраінскія партызанскія злучэнні С. Каўпака, А. Сабурава і А. Фёдарава. Прыбыццё на беларускае Палессе значна ўмацавала іх сілы. У злучэнне А. Сабурава пайшлі ваяваць 300 жыхароў Мазыршчыны, А. Фёдарава — каля 100, С. Каўпака — больш за 50 чалавек. Некалькі дзесяткаў чалавек былі байцамі Вінніцкага і Ровенскага злучэнняў. Вясной 1943 г. тут, у лясах Палесся, фарміравалася і 1-е Малдаўскае партызанскае злучэнне, дзе толькі з двух сельсаветаў раёна, Асавецкага і Скрыгалаўскага, ваявала больш як 100 чалавек. Маюцца звесткі аб удзеле мазыран у партызанскай барацьбе ў Карэліі, Смаленскай, Бранскай, Чарнігаўскай і іншых абласцях. Вядомы імёны каля 250 жыхароў горада і раёна, якія загінулі ў баявых дзеяннях лясной арміі. Толькі на тэрыторыі раёна загінула і пахавана больш як 50 партызан з украінскіх і беларускіх атрадаў, у тым ліку з Мазырскай брыгады імя А. Неўскага — 25 чалавек.

### ГОРАД МАЗЫР

**АРЦЁМАЎ Аркадзь П.,** н. у 1918, партызан 99-й Калінкавіцкай брыгады, загінуў 25.10.1943 у в. Заходы Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.

**ДУЛУБ Рыгор Васілевіч,** н. у 1924, партызан, павешаны 10.8.1943 у г. Мазыр.

**КАЗАЧУК Яўген Іванавіч,** партызан, загінуў у 1943, пахаваны ў г. Хойнікі.

**КАРАСЁЎ Даніла Лазаравіч,** н. у 1911, партызан Мазырскай брыгады імя Аляксандра Неўскага, загінуў 4.7.1943, пахаваны ў в. Раманаўка Мазырскага р-на.

**КРЫЖАНОЎСКІ Антон Яўхімавіч,** н. у 1891, партызан, памёр ад хваробы 10.10.1943 у в. Глазкі Ельскага р-на Гомельскай вобл.

**КУЗМЯНЮК Лука Дзямідавіч,** н. у 1918, партызан 101-й Даманавіцкай брыгады, загінуў 15.9.1943 у в. Узнаж Гомельскай вобл.

**ЛЯЎКО Васіль Рыгоравіч,** н. у 1919, намеснік камандзіра атрада 99-й Калінкавіцкай брыгады, загінуў 25.3.1944 у в. Хвойнае Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

**МАКАРАНКА Максім Ігнатавіч,** сакратар Мазырскага райкама КП(б)Б, камандзір Мазырскага партызанскага атрада ў жніўні — кастрычніку 1941, загінуў у 1943 у Магілёўскай вобл.



Я. І. Казачук



Д. Л. Карасёў